*Лаўрэаты прэміі Ленінскага камсамола*

# МОЛАДЗЬ НАВУКІ

Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка Цэнтрльны Камітэт ВЛКСМ прысудзіў тром маладым гомельскім вучоным — супрацоўнікам Інстытута механікі металапалімерных сістэм АН БССР кандыдату тэхнічных навук М. І. Ягоранкаву, Д. Р. Ліну, кандыдату тэхнічных навук Ю. М. Плескачэўскаму прэмію Ленінскага камсамола 1973 года ў галіне навукі і тэхнікі за работу «Даследаванне кантактных з'яў у працэсах фарміравання і разбурэння металапалімерных сістэм».

Пачатак адзначанай прэміяй работы быў пакладзен некалькі год назад, калі акадэмік АН БССР Уладзімір Аляксеевіч Белы вырашыў ушчыльную заняцца даследаваннем «ахілесавай пяты» новых металапалімерных сістэм — адгезійнай сувязі на мяжы метал—палімер у розных агрэгатных ста нах. Да гэтай работы ён прыцягнуў групу маладых супрацоўнікаў інстытута. Перад даследчыкамі ляжала мала вывучаная галіна фізіка-хімічнай механікі — тэорыя адгезійнага ўзаемадзеяння цвёрдых цел. Пад адгезіяй спецыялісты разумеюць эфект утварэн ня злучэнняў паміж прыведзенымі ў кантакт markroзнароднымі матэрыяламі.

Гісторыя гэтай навукі, і ў першую чаргу яе практычных аспектаў, ідзе далёка ўглыб вякоў. Вядома, што пры раскопках на месцах старажытных паселішчаў знаходзілі па-майстэрстку склееныя статуэткі. Леанарда да Вінчы вывучаў адгезію пры трэнні. 2000 год таму назад грэчаскага філосафа Фалеса-Мілескага і пазней М. В. Ламаносава цікавілі пытанні ўтварэння статыстычнай электрычнасці пры кантакце двух цел.

Але толькі ў апошнія 25 — 30 год вучоныя даведаліся, што прычыны з'яўлення таго або іншага механізму паверхневага ўзаемадзеяння цвёрдых цел тояцца перш за ўсё ў асаблівасцях іх атамнамалекулярнай будовы і ўмоў знешняга асяроддзя, што вызначаюць энергетычны стан паверхневых пластоў. І, нягледзячы на дасягнутыя поспехі ў вывучэнні гэтай праблемы, многія пытанні яшчэ чакаюць свайго рашэння.

З'яўленне палімераў і неабходнасць спалучэння іх з класічнымі матэрыяламі, і перш за ўсё з металамі, паставіла перад даследчыкамі рад новых найскладанейшых задач. Найбольш важнай і актуальнай з іх была задача даследаваць канкрэтныя з'явы ў працэсе фарміравання і разбурэння металапалімерных сістэм: металапалімерных кампазіцыйных металаў і канструкцый, палімерных і металапалімерных пакрыццяў.

Сярод даследчыкаў, якія заняты ў інсытуце гэтай праблемай, хутка пачалі выдзяляцца сваёй мэтанакіраванасцю Юрый Плескачэўскі і Мікалай Ягоранкаў. Іх дзейнасць накіравана перш за ўсё на выяўленне прыроды вывучаемых пытанняў, распрацоўку тэарэтычных уяўленняў аб кантактных рэакцыях, што працякаюць пры ўзаемадзеянні расплаву палімеру з паверхняй металу. Гэта запатрабавала ад іх вывучэння сумежных галін навукі і асваення новых дакладных фізічных і фізіка-хімічных метадаў даследавання — электронна-парамагнітнага рэзанансу, тэрмагравіметрычнага аналізу, інфрачырвонай і мас-спектраскапіі і інш. Крыху пазней да гэтай работы падключыўся выпускнік фізічнага факультэта Гомельскага ўніверсітэта Дзімітрый Лін. Ён унёс у работу выключна скрупулёзныя адносіны да пастаноўкі і правядзення эксперыментаў.

Акадэмік вызначаў задачы, спрачаўся са сваімі маладымі вучнямі, а вучні даймалі гіпотэзамі свайго навуковага кіраўніка. Асноўныя навуковыя канцэпцыі маладых вучоных строга апаніраваліся членамі Навуковага савета інстытута, абмяркоўваліся на семінарах. У выніку нараджаліся новыя ідэі, арыгінальна тлумачыліся новыя фізічныя факты і з'явы. Так было знойдзена тлумачэнне «дзіўным» паводзінам паверхняў разнастайных металаў у сутыкненні з расплавамі палімераў; яны як бы раствараюць у гэтых умовах метал і яго вокіслы, якія з паверхні пераходзяць у палімер, утвараючы металаарганічныя злучэнні.

Было паказана, што тэрмаакісляльныя эфекты адыгрываюць рашаючую ролю ў стварэнні адгезійных злучэнняў палімераў, імі можна кіраваць шляхам увядзення актыўных напаўняльнікаў, замаруджваючых або інтэнсіфіцыруючых тэрмаакісляльнікаў. Уздзеянне гамааблучэннем дае магчымасць значна павысіць адгезійную трываласць рада металапалімерных злучэнняў.

Вынікі тэарэтычных даследаванняў маладых вучоных ляглі ў аснову манаграфіі «Адгезія палімераў да металаў», апублікаваны ў 50 артыкулах, у тым ліку ў такіх агульнапрызнаных вядучых выданнях краіны, як «Даклады Акадэміі навук СССР», «Механіка палімераў», «Паведамленні АН БССР». У многіх выпадках з'яўленне чарговага артыкула ў друку выклікала цікавасць не толькі савецкіх, але і замежных вучоных. Просьбы абмяняцца навуковай інфармацыяй прыходзілі з ГДР і ЗША, Японіі і Польшчы, Францыі і Чэхаславакіі, Балгарыі і Аўстраліі.

Агульнае прызнанне навуковых дасягненняў маладых гамяльчан дазволіла ім напісаць кандыдацкія дысертацыі і абараніць іх: М. І. Ягоранкаву ў 1971, Ю. М. Плескачэўскаму ў 1972 годзе. Д. Р. Лін у бліжэйшы час абараняе дысертацыю ў адной са старэйшых навуковых устаноў краіны — фізіка-хімічным інстытуце імя Л. Я. Карпава.

У апісваемай рабоце асабліва тэарэтычныя даследаванні далі расткі многім вынікам прыкладнога характару. Былі створаны новыя тэхналагічныя прыёмы і метады нанясення металапалімерных пакрыццяў. Работа, якая была прадстаўлена на атрыманне прэміі, уключае 20 вынаходстваў. Многія з іх эфектыўна ўкаранёны і ўкараняюцца на прадпрыемствах рэспублікі і краіны, у тым ліку на Балакоўскім і Светлагорскім заводах штучнага валакна, Мінскім заводзе імя С. Н. Вавілава і радзе іншых.

Літаральна на ўсіх канферэнцыях і сімпозіумах, дзе выступалі маладыя гомельскія вучоныя з дакладамі, іх паведамленні выклікалі вялікую цікавасць спецыялістаў.

Хто ж яны — гэтыя маладыя людзі, каго сёння камсамол назваў лепшымі сярод лепшых, чые работы прызнаў найбольш каштоўнымі дасягненнямі ў галіне навукі і тэхнікі?

Дзяцінства лаўрэатаў праходзіла ў цяжкія гады пасляваеннага станаўлення народнай гаспадаркі Беларусі. Юрый Плескачэўскі выхоўваўся ў сям'і сталяра ў Гомелі, Мікалай Ягоранкаў — у сям'і брыгадзіра паляводчай брыгады племзавода «Ведрыч», а Дзмітрый Лін — у сям'і служачага Рэчыцкага райаб'яднання «Сельгастэхніка». У сем'ях былі закладзены асновы любві да працы маладых людзей, а іх здольнасці праявіліся ўжо ў сярэдняй школе, якую двое з іх закончылі з медалямі. І вышэйшыя навучальныя ўстановы лаўрэаты закончылі з адзнакамі: Мікалай Ягоранкаў — Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, Юрый Плескачэўскі — Кіеўскі політэхнічны інстытут Добра вучыўся ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце Дзмітрый Лін.



Нягледзячы на вялікую разумовую і фізічную нагрузку пры рабоце і вучобе ў аспірантуры, маладыя вучоныя не замыкаліся і не замыкаюцца ў рамках сваіх вузканавуковых інтарэсаў. Яны актыўныя ўдзельнікі камсамольскага і грамадскага жыцця. Камуніст Юрый Плескачэўскі выбіраўся сакратаром камсамольскай арганізацыі, цяпер — член бюро парткома ЛКСМБ, член Рэспубліканскага савета маладых вучоных ЦК ЛКСМБ; камуніст Мікалай Ягоранкаў — член палітбюро інстытута, выбіраўся членам абкома камсамола, выдатны спартсмен; камсамолец Дзімітрый Лін — член бюро пярвічнай камсамольскай арганізацыі і член інстытуцкага савета маладых вучоных. Іх можна часта бачыць выступаючымі з навукова-папулярнымі лекцыямі перад школьнікамі, рабочымі і служачымі.

Учарашнія маладыя навуковыя супрацоўнікі сёння самі сталі кіраўнікамі — Ю. М. Плескачэўскі прызначан вучоным сакратаром і загадчыкам сектара, а М. І. Ягоранкаў узначальвае адну з лабараторый інстытута.

Сёння мы яшчэ раз віншуем з высокай узнагародай Мікалая Івавіча Ягоранкава, Дзмітрыя Рыгоравіча Ліна і Юрыя Міхайлавіча Плескачэўскага і іх навуковага кіраўніка і настаўніка лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Уладзіміра Аляксеевіча Белага.

**А. СВІРЫДЗЕНАК,**
**намеснік дырэктара ІММС АН БССР па навуковай рабоце, лаурэат Дзяржаўнай прэміі БССР.**

**На здымку:** (злева направа): **М. І. Ягоранкаў, Д. Р. Лін, Ю. М. Плескачэўскі.**

Фота **П. Драбышэўскага.**

**(Газета «Гомельская праўда» за 7 лістапада г.г.).**

## ВЫЙГРЫШ — «ЗАПАРОЖАЦ»

Незвычайна радасным было свята Вялікага Кастрычніка для супрацоўніцы навуковага аддзела ўніверсітэта Т. Скрынічэнка. Сёлета яна набыла два білеты грашова-рэчывай латарэі, якую выпусціў Камітэт маладзёжных арганізацый СССР у фонд X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў. І хоць яе тыраж выйгрышаў адбыўся ў верасні, але атрымалася так, што Скрынічэнка ўспомніла пра свае білеты толькі ў першую пятніцу лістапада. Праверыла — і вачам не паверыла: на адзін білет выпаў легкавы аўтамабіль «Запарожац», а другі таксама аказаўся выйгрышным.

Дарэчы, гэта ўжо другі «Запарожац», які выйгран ва ўніверсітэце па фестывальнай латарэі.

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## ВЫЙШЛІ Ў ФІНАЛ

У спартыўнай зале нашага ўніверсітэта праведзены занальныя спаборніцтвы па баскетболу на першынство рэспублікі сярод калектываў студэнцкага таварыства «Буравеснік». Разыгрывалася па дзве пуцёўкі ў фінал. За іх змагаліся мужчынскія каманды ГДУ, Беларускага політэхнічнага інстытута і Гомельскага філіяла БПІ, Брэсцкага педінстытута, віцебскіх тэхналагічнага і медыцынскага інстытутаў, жаночыя — ГДУ, Беларускага інстытута народнай гаспадаркі, Брэсцкага педінстытута і Віцебскага тэхналагічнага інстытута.

Паспяхова выступілі гаспадары пляцоўкі. Мужчыны перамаглі ўсіх сваіх супернікаў і ўпэўнена заваявалі першынство. Другім фіналістам ад гомельскай зоны стала каманда сталічных політэхнікаў.

Сярод жаночых каманд зладжанай гульнёй вызначыліся студэнткі ВІНГ. Яны правялі турнір без паражэнняў. Другая пуцёўка ў фінал дасталася нашым дзяўчатам.

**І. КУЛЬЧЫЦКІ.**

## БЕЗ КАНКУРЭНЦЫІ

**Чатыры гандбольныя каманды—нашага ўніверсітэта, БДУ, Брэсцкага педінстытута і Віцебскага медінстытута — павінны былі разыграць дзве пуцёўкі ў фінал на першынство рэспублікі таварыства «Буравеснік». Аднак віцебляне на спаборніцтвы не прыехалі, і супернікі без асаблівай канкурэнцыі змагаліся за права працягваць барацьбу за вышэйшыя ўзнагароды. Між тым гэта не збавіла накалу барацьбы ў папярэдніх гульнях. Асабліва напружаная праходзіла сустрэча гандбалістаў нашага і Беларускага ўніверсітэтаў. Гульня закончылася з мінімальнай перавагай гаспадароў пляцоўкі. Лік — 24:23.**

**Учора спаборніцтвы закончыліся.**

## ПАМЯЦІ ГЕРОЯЎ

У Ленінградзе федэрацыяй класічнай барацьбы праведзен Усесаюзны турнір «Памяці загінуўшых за Радзіму». На спаборніцтва з дзевяці саюзных рэспублік прыехала каля 300 барцоў.

Трэнер гамяльчан, заслужаны трэнер БССР Г. Казоўскі падрыхтаваў да турніра вопытных барцоў ГДУ: майстра спорту А. Гатальскага, кандыдата ў майстры В. Гатальскага і іншых. Тры туры яны ішлі без паражэнняў.

Майстар спорту А. Грамыка выступаў у адной з самых масавых вагавых катэгорый — да 62 кг., дзе спаборнічалі 38 чалавек. У фінал ён трапіў маючы шэсць перамог (чатыры «чыста» і дзве на ачках). Відавочна, што гэта адбілася на фізічным стане гамяльчаніна, і ён выглядаў у фінале знясіленым. У выніку — паражэнне ад ленінградскага майстра спорту С. Бярдзеева. Аднак трэцяе месца ў турніры — гэта таксама поспех.

**В. ВІНАГРАДАЎ.**

## ФІНАЛІСТ УСЕСАЮЗНАГА

У Кіеве закончыўся Усесаюзны турнір па боксу, прысвечаны вызваленню горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У спаборніцтвах прынялі ўдзел баксёры з 28 гарадоў нашай краіны. Сярод іх чэмпіёны і прызёры саюзных рэспублік, Масквы і СССР. У ліку мацнейшых быў фіналіст чэмпіяната БССР, студэнт ГДУ Валерый Пак.

Усяго толькі адзін раунд спатрэбіўся гамяльчаніну, каб дабіцца перамогі над кандыдатам у майстры спорту А. Усольцавым (Чарнігаў). У паўфінале Валерый сустрэўся з баксёрам, які валодае добрай тэхнікай і тактыкай, — В. Сярдзечным (Кіеў). Спачатку бой складваўся не ў карысць Пака. Але праявіўшы вялікую волю да перамогі, гамяльчанін у трэцім раўндзе прымусіў праціўніка датэрмінова капітуліраваць. Фінальны бой паміж Пакам і В. Хабібуліным (Кіеў) праходзіў ва ўпартай барацьбе. Двое суддзяў з пяці аддалі перавагу гамяльчаніну, трое — яго праціўніку. Валерый Пак падняўся на другую прыступку п'едэстала гонару.

**В. УЛАДЗІМІРАЎ.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком, мясцком універсітэта і калектыў кафедры фізічнага выхавання выказваюць глыбокае спачуванне МАГІЛЕЎЦАВАЙ Тамары Яфімаўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю бацькі.**

АЗ 35673 **«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Фармат —420×300 мм. Тыраж 2000 экз.** Заказ 6427.